# ЖЫЦЬ, ВУЧЫЦЦА І ПРАЦАВАЦЬ ПА-ЛЕНІНСКУ

100

**ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС ЗАКЛІКАЕ РАБОЧЫХ, КАЛГАСНІКАЎ, ІНТЭЛІГЕНЦЫЮ, САВЕЦКІХ ВОІНАЎ АДЗНАЧЫЦЬ 100-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА ІЛЬІЧА ЛЕНІНА НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ПЛАНАЎ КАМУНІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, НАМЕЧАНЫХ ПРАГРАМАЙ КПСС, РАШЭННЯМІ XXIII З'ЕЗДА ПАРТЫІ І ДАКУМЕНТАМІ, ПРЫНЯТЫМІ Ў СУВЯЗІ СА СВЯТКАВАННЕМ 50-ГОДДЗЯ КАСТРЫЧНІКА.**

*(З Пастановы ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна»).*

## ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ ЖУРНАЛІСТАЎ

Нядаўна партыйны камітэт і рэктарат нашага універсітэта адобрылі план мерапрыемстваў і работу партыйнага бюро, дэканата, усіх грамадскіх арганізацый факультэта журналістыкі па падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Шматлікія факты сведчаць, што журналісты сапраўды задаюць тон у выкананні Пастановы ЦК КПСС, умела спалучаюць падрыхтоўку да слаўнага юбілею з далейшым удасканаленнем усёй навукова-даследчай і вучэбна-выхаваўчай работы на факультэце.

Вялікай папулярнасцю тут карыстаюцца «Ленінскія чытанні». Іх адкрыў старэйшы камуніст факультэта кандыдат гістарычных навук дацэнт Марк Саламонавіч Зярніцкі. Тэма яго выступлення «Ленін — правадыр міжнароднага пралетарыята». У бягучым навучальным годзе куратары правялі ў сваіх групах субяседаванні аб жыцці і дзейнасці Уладзіміра Ільіча Леніна, а дацэнты С. А. Лысенка і Я. Л. Бондарава падрабязна расказалі першакурснікам аб метадах яго творчай працы. У плане «чытанняў»—лекцыі і даклады аб ролі У. І. Леніна ў стварэнні і развіцці бальшавіцкага друку, савецкага кіно, аб асабістых клопатах правадыра аб моладзі і іншыя тэмы. Дарэчы, на факультэце журналістыкі «Ленінскія чытанні» адрозніваюцца ад падобных мерапрыемстваў на іншых факультэтах. Так, імі прадугледжаны экскурсіі у музеі, сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі, якія бачылі У. І. Леніна, з паэтамі і пісьменнікамі — стваральнікамі вобраза Уладзіміра Ільіча. Важнае месца адводзіцца падрыхтоўцы і правядзенню навуковых канферэнцый. Напрыклад, канферэнцыю «У. І. Ленін і маладзёжны друк» вырашана правесці ўжо у гэтым навучальным годзе. Камітэт камсамола распрацаваў тэматыку вывучэння студэнтамі пытанняў «Ленін і камсамол». Ім жа рыхтуецца тэарэтычны семінар па працы У. І. Леніна «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура».

Вялікую дапамогу студэнтам у вывучэнні ленінскай спадчыны акажуць ствараемыя на факультэце фанатэка ленінскіх выступленняў і фотастэнды на тэмы: «У. І. Ленін — стваральнік самага дэмакратычнага, высокаідэйнага, масавага перыядычнага друку» і «У. І. Ленін — арганізатар савецкага радыёвяшчання». Выкладчыкі рыхтуюць да друку зборнік артыкулаў аб публіцыстычнай дзейнасці У. І. Леніна. Матэрыялы пішуцца з улікам вучэбных праграм факультэта журналістыкі. Днямі выйшла ў свет кніжка дэкана факультэта журналістыкі дацэнта Р. В. Булацкага «Оружием слова» — аб публіцыстычнай дзейнасці паплечніка У. І. Леніна, старэйшага камуніста Беларусі Панцеляймона Мікалаевіча Лепяшынскага. Кніга выклікала вялікую зацікаўленасць сярод студэнтаў-журналістаў.

Мы расказалі толькі аб некаторых мерапрыемствах і выніках працы гэтага факультэта па падрыхтоўцы да юбілею. Але і з іх бачна, што журналісты горача, цікавымі справамі адгукнуліся на заклік ЦК КПСС: «Будзем і далей працаваць і жыць па-ленінску, ствараючы цудоўны помнік Уладзіміру Ільічу — будынак камунізма, вялікае, дастойнае ўвасабленне яго бессмяротных ідэй».

**С. РУСЕЦКІ.**

## *ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ КАФЕДРЫ*

**На кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў (заг.—дацэнт Т. І. Прытыцкая) стала традыцыяй дапаўняць лекцыі і семінарскія заняткі разнастайнай палітыка-выхаваўчай работай сярод студэнтаў. У зацверджаным нядаўна плане на першы семестр 1968-1969 навучальнага года вялікае месца займаюць мерапрыемствы, якія прысвечаны ленінскаму юбілею. Кафедра замацавала за ўсімі падначаленымі факультэтамі дакладчыкаў, якія выступаюць не толькі на курсах, але і ў інтэрнатах. Вучоныя арганізуюць субяседаванні ў музеях, тэматычныя вечары. Тут ужо распачалася падрыхтоўка да Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых прац па праблемах грамадскіх навук, які прысвячаецца 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.**

**На лекцыях і семінарскіх занятках шырока выкарыстоўваюцца наглядныя дапаможнікі. Хутка студэнты атрымаюць магчымасць слухаць ленінскі голас, выступленні яго памочнікаў—на кафедры сабраны запісы прамоў У. І. Леніна.**

**Ленінскія творы шырока выкарыстоўваюцца ў выхаваўчай рабоце сярод замежных студэнтаў, з якімі арганізуюцца дапаможныя заняткі.**

**Вопыт гэтага дружнага калектыву ў палітыка-выхаваўчай рабоце павінен паслужыць прыкладам для ўсіх кафедр грамадскіх навук.**

**Л. МЯЦЕЛЬСКАЯ.**

**Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!**

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

**ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

№ 27 (718) ● Пятніца, 11 кастрычніка 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

## *ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ*

## НА ПРАВЕРЦЫ ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА

На чарговым пасяджэнні парткома, якое адбылося на гэтым тыдні, разгледжана пытанне аб выхаваўчай рабоце са студэнтамі на кафедрах тэарэтычнай фізікі і рускай класічнай літаратуры.

Аб рабоце кафедры тэарэтычнай фізікі падрабязна далажыў парткому прафесар А. Е. Леваšоў. У абмеркаванні прынялі ўдзел тт. Рабушка, Зяцькоў, Сеўчанка. Адзначана навуковая праца калектыву. За 1968 год супрацоўнікі кафедры надрукавалі і здалі ў друк каля 20 навуковых работ, выступалі з дакладамі на ўсесаюзных і міжнародных канферэнцыях. Праводзілася пэўная палітыка-выхаваўчая работа. Аднак цэлы шэраг пытанняў непасрэдна выхаваўчай работы са студэнтамі выпаў з поля зроку калектыву. У мінулым годзе тут не было асобнага плана выхаваўчай работы, толькі некаторыя пытанні выхавання студэнцкай моладзі былі ўключаны ў агульны план работы кафедры. Куратары мала цікавіліся вучобай і бытам студэнтаў.

У пастанове партыйны камітэт абавязаў калектыў кафедры тэарэтычнай фізікі ліквідаваць адзначаныя недахопы і адобрыў намечаныя мерапрыемствы на бягучы навучальны год.

Справаздачу аб выхаваўчай дзейнасці калектыву кафедры рускай класічнай літаратуры зрабіў прафесар Ф. І. Куляшоў.

Партыйны камітэт адзначыў карысны вопыт, які накапілі супрацоўнікі гэтай кафедры.

---

У мінулую сераду адбыўся агульнауніверсітэцкі партыйны сход, які абмеркаваў вынікі 1967—1968 навучальнага года і задачы камуністаў і ўсяго калектыву па далейшаму ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчай работы. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце, член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР Сцяпан Андрэевіч Умрэйка.

У спрэчках прынялі ўдзел дэканы А. А. Гусак, Р. В. Булацкі, Ф. М. Капуцкі, сакратар партбюро філфака В. А. Захарава, сакратар камітэта камсамола М. Д. Ціва і іншыя. Прынята разгорнутая пастанова па абмеркаванаму пытанню.

Падрабязная справаздача будзе надрукавана ў наступным нумары газеты.

---

## *НАСЦЕННЫ ДРУК ЗНОЎ ТРЫМАЕ ЭКЗАМЕН*

Набліжаецца знамянальная дата ў жыцці беларускага і ўсяго савецкага народа — 50-годдзе Кампартыі Беларусі і БССР. У сувязі з юбілеем рэспублікі партыйны камітэт універсітэта ў сакавіку гэтага года прыняў пастанову, згодна з якой конкурс насценных газет факультэтаў і курсаў праводзіцца ў два туры. Вынікі першага былі падведзены да Дня друку і 150-годдзя з дня нараджэння Карла Маркса. Лепшымі тады былі прызнаны насценгазеты біялагічнага факультэта і факультэта журналістыкі, на другім месцы аказалася «Гісторык» і трэцяе прысуджана «Фізіку».

Цяпер насценны друк універсітэта стаіць перад другім адказным экзаменам — вынікі апошняга тура агляду-конкурсу будуць падведзены перад святам рэспублікі — да 1 студзеня 1969 года. На жаль, многія рэдкалегіі факультэтаў у новым навучальным годзе па-сапраўднаму яшчэ не распачалі сваю работу. Яшчэ не выйшлі свежыя нумары на гістфаку, юрыдычным факультэце, на факультэце журналістыкі і іншых. Між тым часу для падрыхтоўкі змястоўных і добра афармленых газет, якія можна было б прадставіць на конкурс, застаецца мала.

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі павінны ў бліжэйшыя дні дакамплектаваць рэдкалегіі і дапамагчы ім як мага хутчэй уключыцца ў спаборніцтва за званне лепшых.

Напамінаем умовы агляду конкурсу. У аглядзе могуць прыняць удзел усе насценныя газеты універсітэта, факультэтаў, курсаў і груп, студэнцкіх саветаў, навуковых таварыстваў, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі і іншых грамадскіх арганізацый. Для ўдзелу ў другім туры патрэбна прадставіць усе нумары газеты пачынаючы з верасня гэтага года. Прадстаўленне ў рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт» — да 10 снежня, а з 15 снежня газеты будуць вывешаны на агульны агляд у галоўным корпусе.

# ВА УНІВЕРСІТЭТАХ КРАІНЫ

## Камсамольская прыёмная

Ідэя аб стварэнні камсамольскай прыёмнай камісіі нарадзілася ў камітэце камсамола Петразаводскага універсітэта. Прадстаўнікі кожнага факультэта выязджалі ў раёны рэспублікі, каб пазнаёміць выпускнікоў сельскіх школ з правіламі паступлення ў вну, расказаць аб факультэтах, аб тым, як рыхтавацца да ўступных экзаменаў.

Як паказалі субяседаванні, многія абітурыенты яшчэ не ўяўляюць па-сапраўднаму, па-дзелавому сваёй будучай прафесіі.

У час экзаменаў члены камсамольскай прыёмнай камісіі рабілі рэйды ў інтэрнаты, слухалі адказы абітурыентаў, размаўлялі з імі і прадстаўлялі звесткі на залічэнне. Да голасу камсамольскай прыёмнай заўсёды прыслухоўваліся і ў дэканатах.

## Ленініяна фотааматара

**Васіль Раманюк — нястомны шукальнік цікавых сюжэтаў. Апошнія гады аматар працуе над незвычайнай фоталеніянай. Вольны час, водпускі супрацоўнік Ужгарадскага універсітэта В. П. Раманюк прысвячае пошукам людзей, якія ведалі Уладзіміра Ільіча Леніна, паездкам па месцах, звязаных з жыццём і рэвалюцыйнай дзейнасцю генія чалавецтва.**

**Фотааматар праехаў і прайшоў ужо каля дваццаці тысяч кіламетраў. У яго унікальнай калекцыі тысячы рэдкіх здымкаў. Ён друкуе іх у цэнтральных, рэспубліканскіх, абласной газетах, выступае па тэлебачанню з расказамі пра падарожжа па ленінскіх мясцінах. Гэтыя выступленні ён суправаджае дэманстрацыяй фатаграфій.**

**Васіль Раманюк зрабіў паездку па маршруту Ульянаўск — Казань — Астрахань. Гэта падарожжа завяршыла яго знаёмства з ленінскімі месцамі нашай краіны. Летам аўтар фоталеніяны пабываў за мяжой. Матэрыялы гэтай паездкі ўвайшлі ў завяршаючы раздзел вялікай асабістай фотавыстаўкі, якую В. П. Раманюк падрыхтаваў да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.**

## Студэнты-лаўрэаты

*Напярэдадні новага навучальнага года ў Мардоўскі універсітэт прыйшла прыемная навіна — студэнты-выпускнікі універсітэта А. Гер і В. Семаў сталі лаўрэатамі Усесаюзнага конкурсу 1967—1968 навучальнага года на лепшую навуковую працу сярод студэнтаў вну. Іх працы прадстаўлены на ВДНГ.*

## КАРЫСНАЯ ПРАКТЫКА

У развіцці добрасуседскіх сувязей паміж СССР і Японіяй актыўна ўдзельнічаюць і студэнты Далёкаўсходняга універсітэта. Кожнае лета яны прысвячаюць практычнаму аваладанню мовай. Масква, Іркуцк, Хабараўск, Находка, Сахалін, Камчатка — вось далёка не поўны пералік месц, дзе ім прыходзіцца абслугоўваць японцаў у якасці перакладчыкаў. Самую паўнацэнную практыку студэнты атрымліваюць у агенцтвах «Інтурыста» і на суднах замежнага плавання Далёкаўсходняга параходства.

Яшчэ зусім нядаўна, у мінулым годзе, Оля Буланчыкава была студэнткай- выпускніцай філалагічнага факультэта, а сёння яна ўжо настаўніца адной з мінскіх школ. Нястомную энергію былы сакратар камсамольскай арганізацыі філфака цяпер аддае сваім выхаванцам.



*ПАРТЫЙНЫМ і камсамольскім арганізацыям, педагагічным калектывам, прафесарска-выкладчыцкаму саставу неабходна палепшыць вучэбную і выхаваўчую работу ў школах, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Навучанне і выхаванне павінны фарміраваць у студэнтаў і навучэнцаў марксісцка-ленінскі светапогляд, творчае мысленне, цікавасць да навукі і тэхнікі, навыкі грамадскай дзейнасці, рыхтаваць іх да стваральнай працы на карысць народа. Пастаянна ўдасканальваць выкладанне грамадскіх навук, маючы на ўвазе, што без глыбокага вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі, без яснага разумення палітыкі партыі і дзяржавы не можа быць добрага савецкага спецыяліста, актыўнага будаўніка камунізма.*




**(З ПАСТАНОВЫ ЦК КПСС «АБ 50-ГОДДЗІ ВЛКСМ І ЗАДАЧАХ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ»).**

# ПРАГРАМА ДЗЕЯННЯЎ

Нядаўна ў друку была апублікавана пастанова Цэнтральнага Камітэта КПСС «Аб 50-годдзі ВЛКСМ і задачах камуністычнага выхавання моладзі». Гэты надзвычай важны дакумент, у якім падкрэсліваецца непарыўная сувязь гераічнага шляху Ленінскага камсамола з гісторыяй нашай краіны, з мужнай барацьбой усяго савецкага народа за сацыялізм і камунізм, дзе пастаўлены канкрэтныя задачы па далейшаму выхаванню юнакоў і дзяўчат у духу шчырай адданасці сваёй Радзіме, свайму народу, ідэям камунізма, вялікай справе партыі, на нас, шматтысячную камсамолію універсітэта, накладвае яшчэ большыя абавязкі.

Вядома, што камунізм могуць больш паспяхова будаваць людзі, якія неадольна штурмуюць вяршыні навукі і тэхнікі, выхоўваюць у сабе лепшыя якасці калектывіста - арганізатара. Нашы камсамольскія арганізацыі факультэтаў і курсаў будуць і далей удасканальваць, знаходзіць новыя формы навучальнай і выхаваўчай работы, каб з універсітэта выходзіў на працяг самастойнага жыцця выдатны спецыяліст і перакананы носьбіт камуністычнай ідэалогіі, вельмі патрэбны нашай краіне чалавек.

Пастанова ЦК КПСС «Аб 50-годдзі ВЛКСМ і задачах камуністычнага выхавання моладзі» — сведчанне вялікіх клопатаў партыі аб камсамоле. Няхай гэты важны дакумент стане для кожнага студэнта-камсамольца, для ўсёй нашай моладзі баявой праграмай дзейнасці, праграмай барацьбы.

**У. НАУМЧЫК,**
член камітэта камсамола універсітэта.

# ПАКУЛЬ ШТО Ў ЭСКІЗАХ...

**Бадай ніхто не стане адмаўляць важнасці добрых абставін для прыемнага адпачынку і творчай працы. Асабліва важныя для нас, студэнтаў, умовы быту ў інтэрнатах. Канешне, шмат залежыць ад нас саміх.**

**Вельмі часта нашы студэнты скардзяцца на ўмовы быту і адпачынку ў інтэрнатах. Можна пачуць ад «крытычна думаючых» асоб патрабаванне праявіць сваю ініцыятыву на справе.**

**Нарэшце такая магчымасць прадставілася.**

**Камітэт камсамола і прафком даручылі студсаветам разам з членамі камітэта камсамола распрацаваць эскізы афармлення ленінскіх пакояў. Ні для каго не сакрэт, што ленінскія пакоі нашых інтэрнатаў часта выглядаюць, як звычайныя. Цяпер ад нас залежала іх афармленне. Але тыя, хто гаварыў «перапрацаваць»,— зніклі. Толькі юрысты, якія жывуць у інтэрнаце па Паркавай магістралі, падалі свой эскіз, праўда, потым ухіляліся ад яго абмеркавання. Але энтузіясты заўсёды ёсць. У верасні камітэт камсамола стварыў афармiцельскую групу. Нашы мастакі А. Елісееў, К. Марчанка і А. Кадзянчык распрацавалі эскізы. Але потым замест афармлення гэтай групе прыйшлося здабываць розныя матэрыялы. Стала зразумела, што некаторыя з распрацаваных пытанняў у эскізах застануцца толькі на паперы. Чамусьці паказалася немагчымым перафарбаваць у адпаведны колер сцены ленінскіх пакояў у інтэрнатах на Паркавай магістралі і вуліцы Свярдлова. Не змаглі дабіцца дазволу зрабіць стэнды ў майстэрнях.**

**Але ёсць і прыемнае. Аўтарытэт камсамола БДУ вялікі. Нам ахвотна і шмат дапамаглі камсамольцы будтрэста № 1 і камбіната буйнаблочных канструкцый у Мінску, ФЗК у Барысаве, камсамольцы архіва кінафотадакументаў.**

**Пачаўся новы навучальны год. Студэнты зноў у інтэрнатах. Але ў ленінскіх пакоях становішча мала змянілася. Больш-менш дакладна выканалі афармленне ў інтэрнатах па вуліцы Кастрычніцкай (чацвёрты корпус).**

**Застаюцца няўтульна пафарбаванымі сцены пакояў на Паркавай магістралі і вуліцы Свярдлова. Тут, як і раней, не будзе дзённага асвятлення.**

**Зроблена мала. Але можна было зрабіць значна больш. Для гэтага неабходны сумесныя намаганні студсавета, камітэта камсамола, прафкома і, вядома, дапамога адміністрацыйна-гаспадарчай часткі.**

**В. КУШНЕР,**
**старшыня рэвізійнай камісіі камітэта камсамола.**

# ПЕРААДОЛЕЦЬ ІНЕРТНАСЦЬ І РАЗ'ЯДНАНАСЦЬ

*СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ*

На гістфаку адбыўся справаздачна-выбарны прафсаюзны сход выкладчыкаў і аспірантаў. З дакладам выступіла старшыня прафбюро Н. А. Гусакова.

Як адзначалася ў дакладзе, прафбюро ўдзяліла нямала ўвагі паляпшэнню вучэбна-выхаваўчай работы на факультэце, павышэнню кваліфікацыі выкладчыкаў, паляпшэнню жыллёва-бытавых умоў выкладчыкаў і студэнтаў. За справаздачны перыяд абаронена чатыры кандыдацкія дысертацыі, шэраг дысертацый зацверджан да абароны. Выданы манаграфіі Г. М. Ліўшыца і іншых выкладчыкаў.

Прафбюро аказвала дапамогу дэканату і партыйнай арганізацыі факультэта ў паляпшэнні вучобы і дысцыпліны студэнтаў. Вытворчая камісія (тт. Елісееў, Міхайлаў) правярала наведванне заняткаў на вячэрнім аддзяленні, самастойную работу студэнтаў, умовы ў інтэрнаце. Былі зроблены рэйды ў інтэрнат раніцамі, устаноўлена дзяжурства выкладчыкаў у ім у час сесіі, Праводзіліся гутаркі са студэнтамі.

Нядрэнна працавалі жыллёва-бытавая (тав. Сідарцаў) і культурна-масавая (тав. Ганчарова) камісіі, ёсць пэўныя поспехі і ў рабоце спартыўна-масавай камісіі (тав. Ціток).

Далей дакладчык, а затым і выступаючыя адзначылі недахопы, якія пагражаюць закрэсліць усё тое станоўчае, што было зроблена. Прафбюро, яго камісіі часам працавалі раз'яднана і без адпаведнага кантакту з партбюро, дэканатам, не заўсёды даводзілі добрыя справы да канца. Так, не было вырашана вытворчай камісіяй балючае пытанне аб перагрузцы выкладчыкаў, не праводзіліся вытворчыя нарады, на якіх бы знайшло месца абмеркаванне гэтага і іншых важных пытанняў. Многа добрых мерапрыемстваў жыллёва-бытавой і культурна-масавай камісій не было выканана.

Вядома, многае залежала не толькі ад членаў прафбюро, але і ад актыўнасці саміх членаў прафарганізацыі. Многія з іх на справаздачным сходзе прадэманстравалі сваю інертнасць, неарганізаванасць: са 108 членаў прафарганізацыі прысутнічала 54. У меншасці — прадстаўнікі грамадскіх кафедр, ды і ў цэлым неяк не заўважаецца неабходнага кантакту паміж работнікамі гістфака і грамадскіх кафедр.

Прафарганізацыя павінна і можа пераадолець гэту інертнасць, раз'яднанасць і нерашучасць у выкананні важных задач вучэбна-выхаваўчага працэсу. Яе ганаровы доўг — стаць баявым памочнікам дэканата і партыйнай арганізацыі ў справе камуністычнага выхавання студэнтаў. Менавіта гэтым неабходна кіравацца новавыбранаму бюро, у якое ўвайшлі тт. Гусакова, Асіпкоў, Мельцар, Піліпенка, Малевіч, Беркаў і іншыя, усяго 12 чалавек.

На сходзе выбраны таксама дэлегаты на прафсаюзную канферэнцыю універсітэта.

**І. РЭКУЦ.**

# ДВОЙКА
## ПА ПАВОДЗІНАХ



Беласнежныя пакрывалы, акуратныя тумбачкі, стосы кніг, кветкі, Каля стала, засланага чыстай сурвэткай, утульна размясціліся дзяўчаты... Але не варта любавацца гэтай ідылічнай карцінай. Не заўсёды форма адпавядае зместу...

Якраз у той момант, калі адна з нашых гераінь па-дзіцячаму падагнуўшы ногі, зручна ўселася ў крэсла, дзверы пакоя адчыніліся, і ўвайшла стараста паверха.

— Заўтра, адпаведна графіку, вы дзяжурыце,— сціпла напомніла яна і ўжо сабралася выйсці, як гнеў цудоўных стварэнняў, названых студэнткамі, абрушыўся на яе галаву.

— Прыбіраць не будзем! Мы — выпускнікі! — адрэзала адна.

Стараста паспрабавала растлумачыць, што для ўсіх у інтэрнаце існуе адзін парадак. Але куды там! Не далі і рота раскрыць.

— Што ты з ёй размаўляеш! І ўвогуле, дарагая, зачыні дзверы з таго боку,—кінула ў адрас старасты брунетка з замаславатай прычоскай.

— Ты чуеш, што табе сказалі: зачыні дзверы з таго боку!—грозна паўтарыла яна.

Пасля непрыемнай размовы ў каменданцкай іх усё ж назначылі дзяжурыць. Але дарма камендант інтэрната на Паркавай Георгій Міхайлавіч Рабцэвіч чакаў жыхароў 245-й на традыцыйны інструктаж. Ніхто не з'явіўся.

— Мы не прыбіральшчыкамі сюды нанімаліся!—заявіла чарнавалосая, злосна бліснуўшы вачыма з-пад накрашаных веек.

Гісторыя гэта магла б паказацца смешнай, калі б гераіні былі ўзростам маладзей. А гэта ж заўтрашнія настаўнікі, выхавацелі. Ім вось-вось даверацьвыхоўваць дзяцей. А сёння самі выпускніцы з філалагічнага факультэта Драбушэвіч, Букоўская, Капуцкая, Владзіс заслужылі двойку па паводзінах.

**Г. ЯНЧУК.**

# У ГЛЫБІНЮ ВЯКОЎ

Закончылася летняя экзаменацыйная сесія, паспяхова здадзены экзамены, наперадзе летні адпачынак. Але студэнтам-гісторыкам другога курса яшчэ неабходна было замацаваць на практыцы тыя веды, якія яны атрымалі ў працэсе навучальнага года. Вялікая група студэнтаў у саставе археалагічнай экспедыцыі універсітэта выехала ў Оршу, каб прыняць удзел у раскопках аднаго са старажытных гарадоў Беларусі.

На тэрыторыі сучаснай Оршы, на высокім беразе Дняпра, на мысе, які ўтварыўся пры ўпадзенні ракі Оршыцы, знаходзіцца старажытнейшая частка горада — гарадзішча эпохі Кіеўскай Русі. Менавіта тут і трэба было нашым студэнтам распачаць археалагічныя раскопкі.

Неабходна было зняць і перагледзець дзесяткі кубаметраў культурных напластаванняў, каб знайсці тыя рэчы-матэрыялы, якія захоўвала зямля. Патрабавалася цярпенне і акуратнасць, добрасумленнасць і упорства, каб адшукаць у зямлі разнастайныя рэчы — ад чарапкоў бітай пасуды да драбнюткіх бусінак, каб расчысціць і зафіксаваць амаль незаўважальныя сляды старажытных драўляных пабудоў, вымашчэнняў, печаў.



*НА ЗДЫМКУ: раскопкі вядуць Л. Разумкова і А. Жураўлёў.*

*Фота А. САПУНОВА.*

Прыемна і радасна было сваімі рукамі раскапаць і знайсці рэчы, якія некалі служылі нашым продкам.

Праходзячы практыку ў археалагічнай экспедыцыі, студэнты-гісторыкі азнаёміліся з методыкай археалагічных даследаванняў, паглыбілі свае веды па старажытнай гісторыі нашай Радзімы.

**Ю. ДРАГУН,**
**ст. выкладчык, кіраўнік археалагічнай практыкі ў г. Оршы.**

# ДРУЖБА КУЕЦЦА Ў ПРАЦЫ

Просьба рэдакцыі сціслымі радкамі расказаць аб працоўных буднях і адпачынку студэнцкага атрада нашага універсітэта ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы здалася мне надзвычай цяжкай. І сапраўды, як спрасаваць у адзін кароткі расказ 45 багатых уражаннямі дзён? Як з мноства незабыўных фактаў выбраць самыя цікавыя?

Ужо каторы раз пераглядаю свой дарожны дзённік. Магчыма, ён падкажа мне рашэнне гэтай складанай задачы.

Адна за другой праносяцца ў памяці хвалюючыя карціны... Развітанне з Радзімай...

Да перона падкаціў хуткі экспрэс «Масква—Берлін». Падкаціў і замёр, нібы ўздыблены конь. Беспарадкава замітусіліся, заспяшаліся пасажыры, пагойдваючыся, паплылі наперад увесістыя чамаданы і рэчмяшкі. Сэрца заныла ў нейкай салодкай стоме, думкі перапляліся ў запутаным клубку. Як там наперадзе? Што чакае нас у далёкай ГДР?

Кранаецца цягнік. У сяброўскім прывітанні сціснуў рукі Міхаіл Ціва, сакратар камітэта камсамола універсітэта, усміхаюцца праважаючыя. Да пабачэння, Мінск! Да пабачэння, Радзіма!..

Роўна праз суткі мы пад'язджалі ўжо да Геры, месца нашай работы. Пяць гадзін траскай дарогі ў вагоне 2-га класа стамілі кожнага. Хацелася хутчэй даткнуцца да мяккай пасцелі і забыцца ў салодкім сне. Але старэнькі паравоз усё яшчэ натужна пыхкаў, і калёсы трымцелі, нібы ў ліхаманцы. Нарэшце паявіўся вакзал.

Невялічкая станцыя. Праменні ліхтароў ледзьве прабіваюць вязкую завесу туману. І раптам чароўнымі агеньчыкамі ўспыхнулі ў цемры кветкі. Чырвоныя, белыя, блакітныя — яны, нібы свавольныя светлячкі, запалілі ноч. У прыемным здзіўленні мы замерлі перад вокнамі вагона.

— Таварышы, дык гэта ж нас сустракаюць! — здагадаўся хтосьці першым. Адразу неяк пацяплела ўнутры, мацней затахкала сэрца.

Узбуджаныя, не разбіраючыся, дзе чые рэчы, беручы што папала пад руку, высыпалі насустрач студэнты Іенскага універсітэта імя Фрыдрыха Шылера.

Хтосьці з іх не зусім умела, але шчыра заспяваў нашу родную песню, хтосьці прамовіў рускае «здравствуйте». І куды толькі дзявалася стомленасць. На тварах заззялі радасныя ўсмешкі, прастору ўзарвала руская «Калінка»...

Праз два дні нованароджаная брыгада «Гера-68», у састаў якой уваходзіла 38 студэнтаў Іенскага універсітэта і 20 нашых камсамольцаў, выйшла на свой першы працоўны аб'ект. Задача не складаная — пракладваць электрычны кабель для прадпрыемства.

За работу прыняліся з такім натхненнем, што ўжо пасля некалькіх гадзін працы амаль ва ўсіх на руках загарэліся пунцовыя мазалі. Але ніхто не звяртаў увагі. Дробязі! Што значылі яны ў параўнанні з агульным пад'ёмам, які ахапіў кожнага з нас.

Калі ж стомленасць ахутвала мышцы, і лапата, і кірка станавіліся надзвычай цяжкімі, — заспявалі песню. Родную, беларускую. Імгненна цвярдзелі мускулы, нібы ў канцы прыбывала моцы.

Дні ляцелі, як птушкі. Падобныя фразы ўжо сталі штампам. Але што зробіш, калі гэта было і сапраўды так. Сумаваць не хапала часу. Днём праца, па вечарах — канцэрты мастацкай самадзейнасці, спартыўныя гульні, дыспуты з нямецкімі студэнтамі.

— Працуем у дзве змены, — жартавалі рабяты. У гэтым жарце ёсць і доля праўды. За месяц работы мы 4 разы выступілі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці, правялі 6 валейбольных і 2 футбольныя матчы.

Але на першым плане заўсёды заставалася работа. Атрад працаваў зладжана і на дзіва прадукцыйна. Магчыма таму, што кожны з нас разумеў: я — з Савецкай краіны і павінен апраўдаць гэта высокае званне.

Пасля першага працоўнага тыдня на сход брыгады прыйшоў сакратар абкома арганізацыі свабоднай нямецкай моладзі ФДІ Герхард Шродэр.

— Таварышы, я здзіўлен вашай выдатнай працай і рад паведаміць, што брыгада «Гера-68» заваявала Пераходны сцяг абласнога камітэта.

«Сябры пазнаюцца ў бядзе», — гаворыць руская народная прымаўка. «І ў працы», — дабавіў бы я. Бо іменна ў сумеснай працы пазнавалі мы сваіх новых сяброў. Не ўтаю, не адразу раскрылі мы адзін для другога сэрцы. Спачатку дзесьці ў глыбіні душы хавалася насцярожанасць. «Яны жывуць на тэрыторыі былой Германіі, — мроіліся часам у галаве думкі, — магчыма, і сярод тых людзей, якія стралялі ў тваіго бацьку або маці. Хто ведае, ці не аказваюць на іх уплыў гэтыя злачынцы?».

Час развейваў недаверлівасць. З кожным днём мы ўсё больш пераконваліся, што за шчырасцю адносін не крыецца ніякі падман.

Не магу не ўспомніць аднаго яркага прыкладу. Аднойчы мы працавалі недалёка ад дзіцячага сада. У час перапынку дзеці пакінулі сваю выхавацельніцу і акружылі нас цесным колам. Некаторыя з іх забіраліся рабятам на калені і ўсміхаліся сваімі гарэзлівымі вачанятамі. Скончыўся перапынак. Мы пачалі развітвацца са сваімі новымі знаёмымі. І тут многія з іх зусім правільна прамовілі па-руску — «до свидания». Гэта было так нечакана, што мы нават разгубіліся. «Такія малыя карапузы і ўжо ведаюць рускія словы». Магчыма, і дробязны факт, але ён хавае вялікае значэнне.

Не паспелі азірнуцца — прыйшоў апошні дзень работы. 3-га жніўня, роўна ў 12 гадзін дня, на абочыну лягла пераможная горстка зямлі. Моцнае «ура» страсянула паветра...

4-га жніўня наш атрад ужо трымаў кірунак на горад Іену. Пачаўся другі перыяд знаходжання ў ГДР. Цяжка сказаць, які з іх спадабаўся больш. Першы запомніўся сваёй напружанасцю, другі — багатымі ўражаннямі. За 15 дзён падарожжаў мы пазнаёміліся з вядомымі нямецкімі гарадамі Дрэздэнам, Веймарам, Іенай, Лейпцыгам, Берлінам, наведалі памятныя мясціны: Бухенвальд, Трэптаў-парк, домікі Баха, Гётэ, Шылера і многае іншае.

Цяжкім было развітанне...

Цягнік ужо некалькі хвілін стаіць ля перона. Клапатліва снуюць то ўзад, то ўперад насільшчыкі, правадніцы бяспаспяхова заклікаюць у вагоны пасажыраў. Ля нас згрудзіўся вялікі натоўп. Чуецца смех, руска-нямецкая мова.

— Дык не забудзь, пішы!...

—...Павяду па гораду, і ты ўбачыш, які прыгожы наш Мінск.

— Таварышы, хутчэй!..

— Песню, Толік, песню!..

І Анатоль Злобіч, студэнт гістарычнага факультэта, які не раз заварожваў нас сваім цудоўным голасам, зацягвае славутую рускую «Калінку». Дрыжыць, гойдаецца паветра. На момант замерлі праваднiцы, натоўп абрастае ўсё новымі цікаўнымі.

— Ну, да пабачэння, да сустрэчы ў Мінску!

Абдымаюцца, цалуюцца сябры. Ва ўсіх такія кіслыя твары, што адразу і не разбярэш, хто ад'язджае, а хто застаецца.

Сутаргава ўздрыгнуў вагон. Амаль на хаду ўскокваем на прыступкі, прыціскаемся да вакон і адтуль шлём апошнія развітальныя ўзмахі рукой...

Даўно схаваўся ўдалечыні вакзал. Але чыясьці адзінокая рука ўсё яшчэ падае свае сумныя сігналы, быццам спадзяецца, што іх заўважаць...

**І. АСІНСКІ,**
студэнт 3-га курса факультэта журналістыкі.

## БЫЛЫЯ ПОСПЕХІ НАТХНЯЮЦЬ



## ДЗЕНЬ ДВУХГОРБАГА ВЯРБЛЮДА

Гэтае свята было зацверджана нечакана. Першымі ушаноўвалі куміра ў атрадзе «Агеньчык», што працаваў на будаўніцтве рамонтнай майстэрні у Казталаўцы.

Адбылося гэта так...

Раніцай адзін з мясцовых жыхароў выпусціў свайго вярблюда папасвіцца. Шэры прыгажун з усіх ног пусціўся на любімае месца — у лагчыну, што раскінулася на беразе Узені.

Паскораным алюрам, адмахаўшы дзесятак кіламетраў, «Ахмед» (так называлі вярблюда) ужо пачаў снеданне, як раптам убачыў нечаканае. На высокім дрэўцы трапятала цёмнае палотнішча. Ён падняў галаву: «Што б гэта магло быць?»

Ранішні ветрык заказытаў ноздры хвалюючым пахам адборнай солі. Шэры прыгажун адразу ж пакінуў траву і накіраваўся да сілуэтаў чарнеючых наперадзе пабудоў. Добра развіты нюх прывёў жывёліну да кухні студэнцкага атрада. Паколькі вароты былі гасцінна адкрыты, «Ахмед» не замарудзіў прайсці далей.

Соль знаходзілася ў кутку, у мяшку. Вярблюд наступіў на яго край нагой і прыняўся за трапезу. З'еўшы некалькі кілаграмаў солі, «Ахмед» абвёў кухню радаснымі вачыма. Гэта была звычайная пабудова з печкай пасярэдзіне і шматлікімі полкамі па баках. На іх ляжалі прадукты. «Ахмед» раўнадушна пажаваў хлеб, паспрабаваў мяса, зачыхаў ад перцу, перавярнуў бідон з малаком. Тым часам развіднела, і будзільнік паклікаў атраднага повара на сваё месца. Віалета Свірыдава хутка апранулася і выйшла на вуліцу. У перадранішняй цішыні моцна зазвінеў павалены бідон...

Каравул! На дапамогу!

Праз імгненне увесь атрад быў на нагах. Да сабраўшыхся на ганку паўапранутых хлопцаў са сталовай паважна выйшаў вярблюд. Убачыўшы людзей, ён рэзка скіраваў у бок і кінуўся ў стэп.

Наведанне няпрошанага госця не абяцала нічога добрага. Прадукты былі знішчаны, а новыя можна было дастаць толькі да вячэры. «Вось табе, бабуля, і Юр'еў дзень, — цяжка уздыхалі аматары двайных порцый за снеданнем. — Працаваць жа прыйдзецца з пустым страўнікам». Ды і хто б не засумаваў у такім становішчы? Але гэта былі студэнты, і быў сярод іх ніколі не сумуючы камісар Ваня Жураўлёў. А таму падзеі далей адбываліся так...

«Няшчасны» дзень быў аб'яўлен святам — днём двухгорбага вярблюда. Што гэта азначала?

— Вярблюд, — гаварыў Ваня, — можа працаваць без стравы два тыдні. Мы прапускаем снеданне і абед і будзем працаваць без абедзеннага перапынку. За лік эканоміі часу і ў гонар працаўніка стэпу выканаем за адзін дзень па норме на кожны вярблюжы горб.

Усё так і было. Свята закончылася ўрачыстым сходам, на якім быў заслухан «даклад» прараба «Аб ролі вярблюдаў у механізацыі працаёмкіх працэсаў на студэнцкіх будоўлях». Пазней адбыўся багаты пір, дзе па крузе ішлі піялы з шубатам — вярблюжым малаком. Каб рэабілітаваць «Ахмеда», яго гаспадар падарыў студэнтам цэлае вядро гэтага цудоўнага напітку. **М. ЛАТЫШ.**

# З ДЗЁННІКА СТУДЭНЦКІХ БУДАЎНІЧЫХ АТРАДАЎ

## «ВІКТОРЫЯ»

**«Няхай і вашы рукі будуць па локаць вымазаны цэментам і глінай, інакш у доме, пабудавным не вашымі рукамі, вам будзе холадна і сорамна».**

**М. АСТРОЎСКІ.**

Сёння кіно. Мы шукаем клуб. Але дзе ж ён?

— Ідзіце пад тую павець, — і, убачыўшы нашу разгубленасць, сівы аксакал дабавіў:—Вось цяпер вы нам пабудуеце сапраўдны.

Гэта першая размова прымусіла паглядзець на сябе неяк інакш, і мы ўпершыню па-сапраўднаму усвядомілі, што сталі пераўтваральнікамі казахстанскага стэпу, цаліны.

Цаліна! Гэта планета рамантыкаў.

Вам, рамантыкі, вам, пакарыцелі цаліны, вам, будучыя прадаўжальнікі працоўнай славы «Вікторыі», прысвячаецца наш рапарт.

Пяць год віктарыяне крочаць у авангардзе па студэнцкай планеце. І мы, цалiннікі-68, у юбілейны год 10-га студэнцкага эшалона замацоўваем слаўныя традыцыі папярэднікаў і даем запаветы вам, паслядоўнікі:

— Так трымаць!

Мы пакарылі Уральскі стэп, мы прынеслі жыццё ва усе куткі. Хто мы? Што зрабілі?

— Мы — 43 байцы СБА «Вікторыя». Узрост — ад 18 да 28.

За пяць год цаліны мы асвоілі 600.000 рублеў капіталаўкладанняў.

Гатовы да здачы: 3 аўчарні на 800 галоў, 2 двухкватэрныя дамы, клуб, аднакватэрны дом. Здадзен магазін, зроблен капітальны рамонт некалькіх дамоў.

200 чалавек паспяхова прайшлі за пяць год выпрабаванне на вытрымку. З'едзена 294 бараны, адзін вярблюд і два суслікі (у гэтым годзе у Малым Жалязнове Шустоўскім і Ліфшыцам). 162 страўнікі не патрабавалі капітальнага рамонту.

Дарэчы, аб кухні... Калі вы хочаце, каб маці не пазнала вас, можаце карыстацца некаторымі блюдамі фірмы «П. В. Сямёнаў з дочкамі». Фірма дастаўляе абеды на месца работы са скідкай на 10 працэнтаў каларыйнасці.

Дастойнай ацэнкай нашай працы з'явіўся Пераходны Чырвоны сцяг, атрыманы намі за першае месца ў раёне.

Жывём весела. У нас часта бываюць госці. Так, так, госці. Гэта мясцовыя хлопчыкі і дзяўчынкі. Пытаюць Асю Паўлюковіч і Машу Баёк:

— А сёння будзем чытаць вершы ля кастра?

Шчыра кажучы, многа з імі клопатаў, аднак радасці і вяселля больш.

Пастойце! Паслухайце. Звіняць гітары. Што пяюць нашы самадзейныя артысты з ансамбля «Блукаючыя зоркі»?

— «Возвращайся»...

## «ПРАМЕТЭЙ»

«Праметэй» — гэта здорава! «Праметэй» — гэта 64 муляры, штукатуры, саманшчыкі, сталяры. Увогуле звычайныя рабяты, толькі фізікі. Прыехалі будаваць у саўгас «Першамайскі». Працаваць ёсць дзе. Будуем школу, аўчарню, сховішча для гародніны, кароўнік, шэсць аднакватэрных і два двухкватэрныя дамы. Як і ўсе, робім саман. 75 тысяч ужо ёсць! Галоўны аб'ект—радасць і боль наша—інтэрнат школы-інтэрната на 154 месцы. І аўчарня таксама. Здорава, вядома, сваімі рукамі будаваць такія махіны. Балюча таму, што не паспеем здаць іх з-за недахопу будматэрыялаў. Большая частка атрада працуе ў цэнтральнай сядзібе. Астатнія—на Бітыке, на фермах.

Нядаўна камісар Эдзік Доўнар прачытаў даклад у Доме культуры аб юбілею нашай рэспублікі. Ёсць чуткі аб тым, што ён рыхтуе яшчэ адзін даклад. Выступалі з канцэртамі перад мясцовым насельніцтвам. У атрадзе выдаюцца адразу дзве газеты — «Каламбур» і «Бітыкскія ведамасці».

У школе-інтэрнаце жывуць разам з намі хлопчыкі-казахі. А чаму б нам не арганізаваць школу юных фізікаў? Сказана — зроблена. Рабяты чытаюць лекцыі па оптыцы, механіцы, асновах дыферэнцыяльных вылічэнняў, адказваюць на пытанні школьнікаў.

Асабліва многа зрабіў для школы Эдзік Доўнар. Яго лекцыі слухаюць з асаблівай цікавасцю. Добрая педагагічная практыка для нашага камісара! Спатрэбіцца! Ну, а па суботах—традыцыйныя шахматныя баталіі і спартыўныя гульні.

Каму шахматы, каму футбол, а рыбакам — вудачкі ў рукі.

Цаліна! Гэта не толькі работа, не толькі лагер-спадарожнік. Цаліна — гэта ж і песні. Яны ўсюды. Іх спяваюць, напяваюць. Песня ўсюды дапамагае. Цішэй! Алік Васерштром бярэ гітару. Ноч. Касцёр...

Бацькі ў пісьмах: «Як жа гэта вы? Няўжо самі?»—Самі. Хвалімся? Нічога падобнага. Не лепш, не горш за іншых.